# Службовыя часціны мовы

# Злучнік

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

**Злучнікі –**
**словы, якія ўжываюцца для сувязі аднародных членах, частак складанага сказа, самастойных сказаў і частак тэксту:**
***Голасам моцы ціха і важна гром пракаціўся ўгары. (Я. Колас)***
***Прыпякала сонца, ды веяў лёгкі ветрык. (К. Чорны)***
***Над лугам адно бязмежнае ціхае неба. І мы пайшлі. (Я. Брыль)***
***Чытаць мяне навучылі па-руску да школы. А школа ў нашым Загоры была тады польская, з рэдкімі беларускімі ўрокамі. (Я. Брыль)***

**Злучнік –**
**службовая часціна мовы.**
**Ён не змяняецца і не з’яўляецца членам сказа.**

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Злучнікі

## простыя

**Складаюцца з аднаго слова:**
***а, і, але, бо, ці, калі, як і інш.***

*Нам аднолькава сёння свеціць яснае сонца, **бо** на роднай зямлі кожны сэрцам вялікі. (П. Броўка)*

## састаўныя

**Складаюцца з двух і больш слоў:**
***а то, ды і, таму што, як толькі, як быццам, для таго каб, калі… то, як… так і, не толькі… але і, хоць… але і інш.***

***Як толькі** ўзыходзіць зара над зямлёй, дзень радаснай працы займаецца мой. (П. Броўка)*

**У склад некаторых састаўных злучнікаў (таму што, для таго каб, пасля таго як, з-за таго што і інш.) уваходзяць словы, якія могуць выдзяляцца сэнсава і інтанацыйна (таму, для таго, пасля таго, з-за таго). Такія састаўныя злучнікі разрываюцца і размяшчаюцца ў розных частках складаных сказаў. Коска ставіцца тады перад другой часткай састаўнога злучніка.**

*Я гэту мову ўзяў сабе, **таму што** зашмат у ёй было гаротных песень… – Я гэту мову ўзяў сабе **таму, што** зашмат у ёй было гаротных песень… (М. Танк)*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

## Адзіночныя злучнікі

у сказе могуць ужывацца адзін раз

***але, а, і, ды, бы, аднак, або***

*За мужнасць, шчырасць, ласку **і** красу я палюбіў Палессе. (П. Прыходзька)*

## Паўторныя злучнікі

у сказе ужываюцца два разы і больш

***і– і, ці – ці, або – або, то – то, ці то – ці то, не то – не то, ні – ні***

*Шмат злажылі казак, **і** легенд, **і** песень людзі пра балота, пра сваё Палессе. (Я. Купала)*

## Парныя злучнікі

складаюцца з дзвюх частак

Перад другой часткай парнага злучніка заўсёды ставіцца коска

***не толькі… але, калі… то, хоць… але***

***Хоць і** стомлены быў дзед Талаш, **але** заснуў не адразу. (Я. Колас)*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

Па значэнні злучнікі падзяляюцца на
злучальныя і падпарадкавальныя

**Злучальныя злучнікі** *( і, ды, а, але, або, ці, то-то, ні-ні, не толькі… але і інш.) звязваюць аднародныя члены ў простым сказе, раўнапраўныя па сэнсе часткі складаназлучанага сказа, самастойныя сказы ў тэксце або часткі тэксту:*

*Красу птушынага голасу я ведаў перш за ўсё ад жаваранка і шпака. (Я. Брыль)*

**Падпарадкавальныя злучнікі** *(каб, бо, калі, што, як, пасля таго як, таму што* і інш.) *звязваюць нераўнапраўныя па сэнсе часткі складаназалежнага сказа. У такіх сказах можна паставіць пытанне ад адной часткі да другой.*

*Туман не разыходзіўся, (чаму?) бо не было ветру. (Я. Маўр)*

**Падпарадкавальныя злучнікі ўключаюцца ў залежную частку складанага сказа. Перад злучнікамі, якія звязваюць часткі складанага сказа, ставіцца коска.**

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

## Злучальныя злучнікі

### спалучальныя

*і, ды ў значэнні і, і – і, ні – ні, не толькі … але і, як … так і*

спалучаюць аднародныя члены і часткі складаназлучанага сказа, дзеянні (падзеі, з'явы) у якіх адбываюцца адначасова або паслядоўна, адно за другім:
*Непрыкметна прайшоў час і настаў дзень экзаменаў.*
*(Я. Колас)*

### супраціўныя

*а,але, ды ў значэнні але, аднак, затое, хоць і … але*

злучаюць аднародныя члены і часткі складаназлучанага сказа з супраціўным значэннем:
*Прайшла навальніца, але свежасці не прынесла.*
*(В. Вольскі)*

### размеркавальныя

*ці, або, ці – ці, або – або, то – то, не то – не то, ці то – ці то*

звязваюць аднародныя члены і часткі складаназлучанага сказа, у якіх паказваецца чаргаваннне дзеянняў (падзей, з'яў, прадметаў) або магчымасць аднаго дзеяння з двух ці некалькіх:
*Пад гэты гром, пад дождж упарты то тут, то там пачуеш жарты. (Я. Колас)*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

## Падпарадкавальныя злучнікі

- Часавыя (калі, пакуль, ледзь, чуць, як, як толькі, пасля таго як і інш.)
- Прычынныя (бо, таму што, з прычыны таго што, з-за таго што і інш.)
- Умоўныя (калі, калі б, каб, як, раз, абы і інш.)
- Мэтавыя (каб, для таго каб, з тым каб і інш.)
- Параўнальныя (як, чым, быццам, нібы, бы і інш.)
- Тлумачальныя (што, як, каб і інш.)

**Часавыя, прычынныя, умоўныя і мэтавыя** злучнікі звязваюць часткі складаназалежнага сказа, якія ўказваюць на час, прычыну, умову і мэту таго, пра што гаворыцца ў другой частцы. У такіх сказах ад адной часткі да другой можна паставіць пытанні *калі? чаму? пры якой умове? з якой мэтай?*
*Трэба рана ўстаць, ( з яко мэтай? для чаго?) каб хлеба прычакаць. (Прыказка)*

**Параўнальныя** злучнікі ўжываюцца ў той частцы складаназалежнага сказа, якая шляхам параўнання характарызуе тое, пра што гаворыцца ў другой частцы. Да параўнальнай часткі ставіцца патанне *як?*
*Усё зацвіло, загаманіла, (як?) бы жыватворная іх сіла ад сну прыроду абудзіла. (Я. Колас)*
У простым сказе параўнальнымі злучнікамі ўводзяцца параўнальныя звароты:
*З гнёздаў буслы пазіраюць і дзюбамі, стрэлкамі нібы, паказзваюць шлях. (М. Лужанін)*

**Тлумачальныя** злучнікі ўключаюцца ў тую частку складаназалежнага сказа, якая тлумачыць, паясняе сэнс пэўнага члена другой часткі. Да часткі з такімі злучнікамі ставіцца пытанне ўскоснага склону:
*Міхась і не заўважыў, (чаго?) як прайшоў першы дзень навукі. (Я. Колас)*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ